Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 269 (338) ПЯТНІЦА 22 ЛІСТАПАДА 1940 г.

Цана 10 капеек.

ЯШЧЭ ШЫРЭЙ РАЗГОРНЕМ РАБОТУ ПА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНАМУ ВЫХАВАННЮ ПРАЦОЎНЫХ

Заўтра ў Беластоку адкрываецца першая абласная канферэнцыя МОПР'а. Яна падвядзе вынікі работы арганізацыі за 11 месяцаў і наменіць канкрэтныя мерапрыемствы па далейшаму разгортванню інтэрнацыянальнага выхавання працоўных.

Абласная арганізацыя МОПР'а пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі за прайшоўшы перыяд правяла сярод працоўных вялікую масавую работу. Сотні дакладаў і лекцый прачытаны мопраўскім актывам на прадпрыемствах і ў вёсках вобласці.

Мопраўскія ячэйкі нашай вобласці арганізавалі масавы збор сродкаў для аказання дапамогі вязням капітала і іх дзецям. Мопраўцы беластоцкага тэкстыльнага камбіната № 3 сабралі добраахвотных ахвяраванняў на суму 1.374 рублі, ячэйкі Крынкаўскага раёна сабралі 1.000 рублёў. Усяго па вобласці працоўнымі ўнесена ў дапамогу барацьбітам рэволюцыі каля 60 тысяч рублёў.

Працоўныя нашай вобласці ведаюць, што такое МОПР, бо не раз карысталіся дапамогай мопраўскай арганізацыі. Яны перанеслі ў былой панскай Польшчы нямала пакут. У сваёй мопраўскай рабоце яны няўхільна будуць кіравацца ўказаннямі вялікага правадыра таварыша Сталіна, дадзенымі ў адказ на пісьмо комсамольца Іванова.

«Трэба ўсіліць і ўмацаваць інтэрнацыянальныя сувязі рабочага класа СССР з рабочым класам буржуазных краін; трэба арганізаваць палітычную дапамогу рабочага класа буржуазных краін рабочаму класу нашай краіны на выпадак ваеннага нападу на нашу краіну, роўна як арганізаваць усялякую дапамогу рабочага класа нашай краіны рабочаму класу буржуазных краін...»

Беластоцкая абласная арганізацыя МОПР'а стала масавай арганізацыяй працоўных. У яе радах зараз налічваецца 46 тысяч членаў. У рады МОПР'а толькі за апошні месяц прынята: у Гродне 3.000 чалавек, у Крынках—больш 1.000 чалавек, у Чыжаве—больш 500 чалавек.

Мопраўцы нашай вобласці прымаюць актыўны ўдзел ва ўсіх палітычна-гаспадарчых кампаніях. Вялікую работу праводзяць актывісты МОПР'а зараз, у дні кампаніі па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. У Беластоку ў часць прадстаячых выбараў праведзена 6 інтэрнацыянальных вечароў, на якіх прысутнічала каля 4 тысяч чалавек. У якасці агітатараў і членаў выбарчых камісій зараз працуюць у Беластоку каля 350 актывістаў-мопраўцаў, у Гродне—50. 39 чалавек з ліку мопраўскага актыва вылучаны кандыдатамі ў Беластоцкі гарадскі Совет, 23—у Гродненскі горсовет. Старшыня абкома МОПР'а тав. Рэгіна Каплан вылучана і зарэгістрыравана кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета.

На высокім палітычным узроўні прайшлі справаздачна-выбарчыя сходы ў мопраўскіх ячэйках і раённых канферэнцыі МОПР'а. Даклады і спрэчкі па іх былі накіраваны на тое, каб яшчэ лепш разгарнуць мопраўскую работу, каб яшчэ шырэй разгарнуць работу па інтэрнацыянальнаму выхаванню працоўных.

Дні справаздачна-выбарчай кампаніі ў многіх ячэйках, гарадах і раёнах азнаменаваны новымі поспехамі ў рабоце МОПР'а. Створаны дзесяткі стаханаўскіх брыгад імені МОПР'а. Адбылся значны рост мопраўскіх радоў. У Беластоку арганізавана 20 новых стаханаўскіх брыгад імені МОПР'а. На прадпрыемствах вобласці цяпер працуюць да 50 такіх брыгад. На беластоцкім тэкстыльным камбінаце № 3 брыгада мопраўцаў на чале з тав. Зеленкевіч сістэматычна выконвае свае вытворчыя заданні на 130—140 процантаў.

Вялікія дасягненні нашай абласной мопраўскай арганізацыі за такі кароткі тэрмін тлумачацца тым, што мопраўскай работай у вобласці штодзённа кіруюць партыйныя арганізацыі. Пытанні мопраўскай работы не раз абмяркоўваліся ў абкоме КП(б)Б, на пасяджэннях бюро гаркомаў і райкомаў КП(б)Б, на партыйных сходах у пярвічных арганізацыях.

Разам з тым трэба адзначыць, што ў рабоце мопраўскіх арганізацый ёсць і недахопы. Слаба, напрыклад, пастаўлена работа ў вёсках. У Бранскім раёне арганізаваны тры вясковыя ячэйкі, у якіх налічваецца толькі 70 членаў МОПР'а. У вёсках Ваўкавыскага раёна ёсць толькі 4 ячэйкі. Дрэнна пастаўлена работа ў вёсках і сёлах Цеханавецкага, Монькаўскага і іншых раёнаў. У цэлым па вобласці мопраўскім членствам ахоплена не больш 7 тысяч сялян. Недастаткова разгорнута работа і ў некаторых гарадах. Асабліва слаба разгортваецца работа ў гарадах сярод хатніх гаспадынь. У Беластоку арганізавана ўсяго 12 ячэек пры домакіраўніцтвах, а ў астатніх гарадах іх яшчэ зусім няма.

Партыйныя, комсамольскія і профсаюзныя арганізацыі гарадоў і раёнаў вобласці павінны паўсядзённа аказваць мопраўскім ячэйкам і іх кіруючым органам практычную дапамогу. У рабоце МОПР'а павінны актыўна ўдзельнічаць усе комуністы і комсамольцы.

Неабходна партыйнае кіраўніцтва мопраўскімі ячэйкамі паставіць так, каб дабіцца поўнага і своечасовага вырашэння абласной арганізацыяй МОПР'а ўсіх пастаўленых перад ёю задач па расшырэнню сваіх радоў, па інтэрнацыянальнаму выхаванню працоўных.

Гарачае, большэвіцкае прывітанне дэлегатам першай Беластоцкай абласной канферэнцыі МОПР'а!

У ЦК КП(б) Беларусі

16 лістапада г. г. ЦК КП(б) Беларусі заслухаў даклад начальніка Упраўлення працоўных рэзерваў пры СНК БССР тав. Хасіна аб падрыхтоўцы да пачатку вучэбнага года ў рамесленых і чыгуначных вучылішчах і школ фабрычна-заводскага абучэння. ЦК КП(б)Б устанавіў, што партыйнымі і совецкімі арганізацыямі праведзена вялікая падрыхтоўчая работа па стварэнню дзяржаўных працоўных рэзерваў. У рэзультаце поўнасцю падрыхтаваны да вучэбнага года 9 рамесленых і 5 чыгуначных вучылішчаў і 38 школ ФЗА. У астатніх 5 рамесленых і 1 чыгуначным вучылішчах заканчваецца падрыхтоўка. Прызыў у рамесленыя і чыгуначныя вучылішчы і школы ФЗА ў большасці сваёй праходзіць арганізавана. У рэспубліцы павінна быць прызвана 30.160 чалавек. Паступіла-ж заяў на гэтыя месцы ад 50.490 чалавек.

Разам з тым ЦК КП(б)Б устанавіў, што з боку асобных партыйных, совецкіх і гаспадарчых кіраўнікоў мающь месца недапушчальныя адносіны да пытання своечасовай падрыхтоўкі матэрыяльнай базы для рамесленых вучылішчаў і школ ФЗА. Так, у Пінскай, Вілейскай, Баранавіцкай абласцях, у гор. Гродна, Беластоцкай вобласці, не прыняты своечасова мер і зацягнулі падрыхтоўку вучэбна-вытворчых майстэрань, інтэрнатаў і сталовых для рамесленых вучылішчаў і школ ФЗА да вучэбнага года. Асобныя дырэктары прадпрыемстваў няправільна зразумелі свае задачы па стварэнню дзяржаўных працоўных рэзерваў, паднялі вузкаведамственна, не па-дзяржаўнаму да выканання гэтага важнейшага мерапрыемства. Начальнік Заходняга рачнога параходства т. Куранкоў, даведаўшыся аб перадачы ФЗВ Упраўленню працоўных рэзерваў, спыніў дабудову газагенератарнага цэха ФЗВ і засяліў пабудаваны інтэрнат ФЗВ работнікамі параходства. Дырэктар Гродненскага велазавода т. Вайнеронаў спыніў фінансіраванне рамесленага вучылішча пасля перадачы яго Упраўленню працоўных рэзерваў.

ЦК КП(б)Б прыняў па гэтаму пытанню адпаведнае рашэнне. ЦК КП(б)Б абавязаў абкомы, райкомы і гаркомы КП(б)Б, народных камісараў і дырэктараў прадпрыемстваў прыняць усе неабходныя меры, якія-б забяспечылі поўную падрыхтоўку рамесленых, чыгуначных вучылішчаў і школ ФЗА да вучэбнага года. Наркому лёгкай прамысловасці т. Кургану, наркому тэкстыльнай прамысловасці т. Аляксееву, наркому лясной прамысловасці т. Гайсіну, наркому гандлю т. Шаурову, старшыням Белкаапромсовета т. Марголіну, Белкааўсаюза т. Катаводаву і Белкалеспромсаюза т. Лапета прапанавана неадкладна ўзяць пад асабісты кантроль выраб, адгрузку і прасоўванне рамесленым вучылішчам абсталявання для вучэбна-вытворчых майстэрань, інтэрнатаў, сталовых, абмундзіравання і пасцельных прыналежнасцей.

ЦК КП(б)Б абавязаў начальнікаў чыгунак — Беларускай — т. Красноабаева, Заходняй — т. Горных, Брэсцкай — т. Бурыкіна, Беластоцкай — т. Бадунова — устанавіць за падрыхтоўкай і адпраўкай эшалонаў прызванай моладзі ў рамесленыя, чыгуначныя вучылішчы і школы ФЗА, а таксама за ўнечарговай пагрузкай, прасоўваннем і своечасовай дастаўкай грузаў для рамесленых, чыгуначных вучылішчаў і школ ФЗА.

Наркому гандлю т. Шаурову прапанавана прыняць усе меры для забеспячэння рамесленых, чыгуначных вучылішчаў і школ ФЗА спецвопраткай, падручнікамі і вучэбнаглядными дапаможнікамі, к 20 лістапада падрыхтаваць сталовыя, забяспечыўшы іх прадуктамі харчавання ў адпаведнасці з устаноўленым кантынгентам і нормамі СНК СССР.

СПАБОРНІЦТВА ЛЕСАРУБАЎ І ВОЗЧЫКАЎ

У адказ на заклік стаўбцоўскіх лесарубаў

Пісьмо стаханаўскай брыгады стаўбцоўскіх лесарубаў знайшло жывейшы водгук сярод сялян Трасцянскага сельсовета. Сельсовет распрацаваў рад мерапрыемстваў па выкананню плана чацвертага квартала. Сяляне паранілі да 15 снежня выканаць план лесавывазак.

Ужо загатоўлена і вывезена 700 кубаметраў лесу. Усяго трэба вывесці 1.000 кубаметраў. На Тыкоцінскім лесаўчастку цяпер ідзе ажыўленая работа. Лепшыя паказчыкі даюць возчыкі тт. Айзенштадт і Курцгорскі, якія выконваюць сваё заданне на 200 процантаў.

Л. Харанжынская,
старшыня Трасцянскага сельсовета.

Сустрэча выбаршчыкаў са сваімі кандыдатамі ў дэпутаты

Будзем галасаваць за нашага кандыдата

З вялікім уздымам і актыўнасцю прайшоў сход выбаршчыкаў 46-й выбарчай акругі. Прысутнічала каля 150 выбаршчыкаў.

Пасля даклада старшыні акруговай камісіі тав. Мядзведка аб прадстаячых выбарах, слова прадастаўляецца кандыдату ў дэпутаты гарадскога Совета Антаненка Еўгеніі Сергееўне — работніцы 4-га тэкстыльнага камбіната. Выбаршчыкі цёпла сустракаюць свайго кандыдата.

Тав. Антаненка расказала аб сваім беспрасветным жыцці ў былой панскай Польшчы. Вучыцца яна не магла, бо не было грошай. 12-гадовай дзяўчынкай яна павінна была дапамагаць мацеры пракарміць сям'ю, шукала «шчасця» на розных фабрыках. Многа год была беспрацоўнай.

Совецкая ўлада адкрыла для Еўгеніі Антаненка светлы шлях. Яе, як лепшую работніцу апаратнапрадзільнага цэха, у сакавіку 1940 года вылучылі начальнікам цэха. Яна нястомна арганізоўвае соцыялістычнае спаборніцтва сярод рабочых, стварае ўмовы для стаханаўскай работы. І гэта дае свае вынікі. Цэх выканаў пaveragingу...

Выбаршчыкі абяцалі 15-га снежня галасаваць за свайго дастойнага кандыдата.

Е. Радкевіч.

Сустрэча з кандыдатамі

У памяшканні 27-га выбарчага ўчастка многалюдна. Сюды сабраліся выбаршчыкі 98-й і 100-й выбарчых акруг на сустрэчу з сваімі кандыдатамі.

Старшыня ўчастковай выбарчай камісіі тав. Цыгельніцкая адкрывае сход. У зале становіцца ціха. Усе прыслухоўваюцца, што скажа іх старшыня. Пасля ўступнай прамовы выступілі кандыдаты ў дэпутаты гарадскога Совета дэпутатаў працоўных тт. Аляксандра Іванаўна Максімовіч і Яніна Фамінічна Петручук.

Петручук і Максімовіч—ткачыхі-стаханаўкі. Яны прымаюць актыўны ўдзел у грамадскай рабоце фабрыкі. Тав. Петручук — арганізатар мопраўскай брыгады ў цэху, першая стаханаўка-двухстаночніца.

Ярка гаварыў агітатар Кракоўскі аб выбарах у былой Польшчы і прадстаячых выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

На сустрэчы выступіла 5 чалавек.

А. Стасенка.

«о»

Рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты Ломжынскага гарадскога Совета

Акруговыя выбарчыя камісіі г. Ломжы прыступілі да рэгістрацыі кандыдатаў. Ужо зарэгістрыравана 42 кандыдаты. Па выбарчай акрузе № 3 зарэгістрыраван Эдмунд Эдуардавіч Невядомскі, 1888 года нараджэння, па нацыянальнасці паляк, беспартыйны, працуе слесарам на заводзе сельскагаспадарчых машын. Тав. Невядомскі з'яўляецца брыгадзірам. У перадкастрычніцкім соцыялістычным спаборніцтве яго брыгада дабілася выканання плана на 200 процантаў.

На выбарчай акрузе № 40 зарэгістрыравана Фейга Ісакаўна Сапір, 1917 года нараджэння, комсамолка, работніца-стаханаўка ватнай фабрыкі. Тав. Сапір прымае актыўны ўдзел у грамадскай рабоце. Вытворчую норму выконвае на 150—180 процантаў.

Януш Казіміравіч Грахульскі, 1912 года нараджэння, паляк, беспартыйны, інжынер будаўнічага ўчастка. Ён зарэгістрыраван кандыдатам у дэпутаты гарадскога Совета па 58 выбарчай акрузе.

Па 49-й выбарчай акрузе зарэгістрыраван Ізідар Станіслававіч Станішэўскі, 1907 года нараджэння, беспартыйны, рабочы шавецкай арцелі «Свабода». Тав. Станішэўскі—стаханавец, добры грамадскі работнік.

Па 27-й выбарчай акрузе зарэгістрыраван Канстанцін Іванавіч Трачэўскі, 1902 года нараджэння, дырэктар сярэдняй польскай школы.

Е. Крэснікаў.

Прыбыццё Славацкай Гандлёвай Дэлегацыі

20 лістапада г. г. ў Маскву прыбыла Славацкая Гандлёвая Дэлегацыя ў саставе: Старшыні Дэлегацыі п. Юр Орсаг і членаў Дэлегацыі: п. Пазман — Дырэктара Славацкага Нацыянальнага Банка, п. Дзікашчаніна — Галоўнага Міністэрскага Камісара Міністэрства Фінансаў, п. Петарка — Галоўнага Камісара Міністэрства Народнай Гаспадаркі, п. Станек — сакратара Цэнтральнага Таварыства Славацкай прамысловасці і п. Ондрушэк — Загадчыка Аддзелам заводаў «Баця».

На Беларускім вакзале Дэлегацыю сустрэлі: Член Калегіі і Начальнік Аддзела Гандлёвых Дагавароў Наркамата Знешняга Гандлю Д. Д. Мушустын, намеснік загадчыка Цэнтральна-Еўрапейскім аддзелам Наркамата Замежных Спраў т. Е. С. Гармаш, Начальнік Пратакольнай Часці Наркамата Знешняга Гандлю т. С. А. Шуйкоў, рэферэнт Наркамата Знешняга Гандлю т. Л. І. Золатава, а таксама састаў Славацкай Місіі ў Маскве на чале з Надзвычайным Пасланнікам і Паўнамоцным Міністрам п. Цiсо (ТАСС).

У апошнюю гадзіну

Газета „Політыка“ аб ваенных дзеяннях у Грэцыі

БЕЛГРАД, 21 лістапада. (ТАСС). Афінскі карэспандэнт газеты «Політыка» паведамляе: «Бой каля Корчы працягваецца. Грэчаскія войскі, не гледзячы на непраходную мясцовасць у гарах і на жорсткія налёты італьянскай авіяцыі, працягваюць наступаць. Грэчаская лёгкая артылерыя бамбардзіруе аэрадром у Корчы».

Звяволенне маршала Бойда

ЛОНДАН, 21 лістапада. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае камюнікэ англійскага міністэрства авіяцыі, у якім падцвярджаецца, што намеснік галоўнакамандуючага англійскімі ваенна-паветранымі сіламі на Блізкім Усходзе Маршал Бойд папаў у палон к італьянцам.

По Советской краіне

ЭКСПАНАТЫ З НЬЮ-ЙОРКСКАЙ ВЫСТАЎКІ ДАСТАЎЛЕНЫ У МАСКВУ

У сталіцу прыбылі з далёкага ўсхода 10 вагонаў з экспанатамі Совецкага павільёна на Міжнароднай выстаўцы ў Нью-Йорку. У бліжэйшы час у Маскву будзе даcтаўлена і астатняя маёмасць павільёна СССР.

За пяць з паловай месяцаў у павільёне пабывала 16,5 мільёна чалавек—амаль 80 процантаў наведвальнікаў выстаўкі. Гэтыя лічбы сведчаць, якім велізарным поспехам карыстаўся Совецкі павільён, наколькі вялікая цікавасць у Амерыцы да нашай краіны.

—o—

СТАНОК-ГІГАНТ

З Харкава ў Маскву даставлен станок-гігант, эроблены на заводзе імені Молатава. Ён прадназначан для апрацоўкі мрамара і граніта, якія пойдуць на аздабленне найвялікшага будынка ў свеце—Палаца Советаў. Станок перавозіўся ў разабраным выглядзе на 12 чыгуначных платформах.

Каб меркаваць аб размерах станка, дастаткова сказаць, што ён важыць каля 180 тон і на ім можна апрацоўваць гранітныя калоны даўжынёй да 12 метраў і дыяметрам у 1,5 метра.



Памяшканне школы № 11 па Вялікай Ордынцы (Масква), адведзенае пад рамесленае вучылішча станкабудаўнічага завода імені С. Орджанікідзе.
Фота П. Ігнацэнка. Фота ТАСС.

У ГАЛОЎНЫМ УПРАЎЛЕННІ ПРАЦОЎНЫХ РЭЗЕРВАЎ

Галоўнае Упраўленне працоўных рэзерваў пры Соўнаркоме СССР падвяло вынікі 10 дзён прызыву гарадской і калгаснай моладзі ў школы ФЗА, рамесленыя і чыгуначныя вучылішчы.

З 10 па 19 лістапада ў школы і вучылішчы прынята 513.565 чалавек, або 85,2 проц. устаноўленага кантынгента. У тым ліку ў рамесленыя вучылішчы прынята 267.047 чалавек, у чыгуначныя вучылішчы—30.693 чалавекі, у школы фабрычна-заводскага абучэння— 215.825 чалавек.

У парадку добраахвотнага набору прынята 73,6 проц. агульнай колькасці прызваных. Па звестках, якія паступілі з 65 абласных, краявых і рэспубліканскіх упраўленняў працоўных рэзерваў, гарадской моладзі прызвана 210.257 чалавек, калгаснай—195.976.

Поўнасцю закончан прызыў у Паўночна-Асецінскай і Чувашскай АССР, Чарнігаўскай і Валагодскай абласцях.

У бліжэйшыя дні пачынаецца адпраўка калгаснай моладзі, прызванай у школы ФЗА, рамесленыя і чыгуначныя вучылішчы Масквы, Ленінграда, Данбаса і іншых прамысловых раёнаў СССР. (ТАСС).

СІБІРСКІ АНСАМБЛЬ НАРОДНАЙ ПЕСНІ І ПЛЯСКІ

У Новасібірскім Доме народнай творчасці арганізуецца сібірскі самадзейны ансамбль народнай песні і пляскі. У саставе ансамбля 50 удзельнікаў. Рэпертуар калектыва складаецца з твораў, адлюстроўваючых даўнюю і сучасную Сібір і цяперашнюю Сібір.

НА ЗДЫМКАХ ФІЛЬМА «ВАЛЕРЫЙ ЧКАЛАЎ»

ЛЕНІНГРАД. Сотні ленінградцаў днямі былі сведкамі незвычайнага відовішча: двухмясцовы самалёт, стартаваўшы на Петрапаўлаўскую крэпасць, пранёсся пад адным з пралётаў Кіраўскага маста. Праз некалькі мінут ён паўтарыў гэты смелы і цяжкі палёт у зваротным напрамку. Пастановачны калектыў кіностудыі «Ленфільм» здымаў адну з цікавых сцэн фільма «Валерый Чкалаў», якая паўтарае эпізод палёту В. П. Чкалава на сухапутным самалёце пад мастом праз Неву.

У распараджэнне пастановачнага калектыва быў прадастаўлен самалёт, якім кіравал лётчык Е. Барысенка. Шэф-аператар А. Гінзбург здымаў цікавы кадр, знаходзячыся ў кабіне самалёта; акрамя таго, сцэна здымалася з рачнога катера і з берагу Невы. (ТАСС).

КАНДЫДАТЫ Ў ДЭПУТАТЫ АБЛАСНОГА СОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

Выбаршчыкі Тварагоўскай выбарчай акругі № 89, Цэханавецкага раёна! 15 снежня ўсе як адзін аддавайце свае галасы за Аляксея Міхайлавіча МІСНІКЕВІЧА!

★ ★ ★

Аляксей Міхайлавіч Міснікевіч

(*БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС*)

1917 год. Кастрычнік. Шумна і многалюдна ў пакоях і карыдорах Смольнага. Прадстаўнікі петраградскіх прадпрыемстваў, пасланцы з фронта, з вёсак. Усе прыбывалі сюды па важных і неадкладных справах.

Тут, у Смольным, быў у тыя дні і Аляксей Міхайлавіч Міснікевіч — малады фельчар. Ён дапамагаў у арганізацыі санітарных атрадаў для Чырвонай гвардыі.

— Ніколі не забуду тых дзён, — расказвае Аляксей Міхайлавіч. — Ніколі не забуду тых мінут, калі Ленін быстра праходзіў па карыдорах і ветліва вітаўся з супрацоўнікамі і наведвальнікамі Смольнага.

Пасля Смольнага — Чырвоная гвардыя, фронт. Не аднаго раненага выратаваў Аляксей Міхайлавіч! У барацьбе супроць генерала Дутава прышлося замяняць і ўрача. Пазней у якасці воінскага фельчара ўдзельнічае ў барацьбе за совецкую радзіму на Усходнім і врангелеўскім франтах. У радах Чырвонай Арміі ён служыць да 1923 года.

Па сканчэнні ваенных дзеянняў на ўсіх франтах, тав. Міснікевіч з той-жа энергіяй, з такім-жа запалам уключаецца ў работу. Некаторы час працуе фельчарам, а потым пераходзіць на партыйную, гаспадарчую і совецкую работу.

З'яўляючыся фельчарам у вёсцы Мядзведкі (Лагойскі раён), у 1923 годзе і да жніўня 1924 года Аляксей Міхайлавіч праводзіць вялікую грамадскую работу, дапамагае ў рабоце сельсоветаў, чытае лекцыі і даклады на палітычныя і медыцынскія тэмы.

З Лагойскага раёна тав. Міснікевіч пераязджае на Украіну. Там ён працуе да жніўня 1931 года, дзе быў больш усяго на партыйнай рабоце. Працаваў загадчыкам агітацыйна-масавым аддзелам Нагайскага райкома КП(б)У, потым сакратаром Чэрнігаўскага, Вясёлаўскага і Мошынскага райкомаў.

У жніўні 1931 года тав. Міснікевіча накіроўваюць на работу ў



БССР. У якасці сакратара райкома КП(б)Б ён працуе спачатку ў Узденскім, потым — Крупскім і Халопеніцкім раёнах.

1937—1939 гады. Аляксей Міхайлавіч наладжвае фінансавую работу на Віцебшчыне. Ён, як старшы рэвізор абласнога фінансавага аддзела, па-большэвіцку змагаецца за поўнае ажыццяўленне фінансавай дысцыпліны, змагаецца супроць усякіх парушэнняў яе.

У верасні 1939 года тав. Міснікевіч зноў прызываецца ў рады любімай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. Разам з іншымі таварышамі ён накіроўваецца ў Заходнюю Беларусь для вызвалення сваіх адзінакроўных братоў. Яго назначылі ваенным камісарам адной з часцей.

Пасля скончэння аперацый тав. Міснікевіч дэмабілізуецца з арміі і праз некаторы час прыязджае ў Беласток на кіруючую работу. У абласным фінансавым аддзеле працуе начальнікам штатнага сектара да кастрычніка 1940 года. З кастрычніка 1940 года—старшыня Цэханавецкага райвыканкома. І вось зараз працоўныя Цэханавецкага раёна вылучылі тав. А. М. Міснікевіча кандыдатам у дэпутаты Беластоцкага абласнога Совета па Тварагоўскай выбарчай акрузе № 89.

Пройдзены жыццёвы шлях тав. Міснікевіча характарызуе яго як адданага сына нашай радзімы.

* * *

Тав. А. М. Міснікевіч, сын селяніна-бедняка, па нацыянальнасці беларус, нарадзіўся ў 1898 годзе ў вёсцы Гнесічы, Любчанскага раёна (Баранавіцкая вобласць).

У 1914 годзе, будучы 16-гадовым юнаком, Аляксей пакідае сваю вёску і едзе ў Мінск, каб знайсці сабе работу. Але і ў Мінску ён нічога добрага не знайшоў. Працуючы дворнікам, атрымліваў у месяц па 5 рублёў. Прышлося пакінуць работу. Пераехаў у Петраград, дзе ўстроіўся ў якасці рабочага на бісквітна-шакаладнай фабрыцы. І тут жыццё аставалася ўсё на тым-жа ўзроўні, цяжкім і бязрадасным...

Толькі Кастрычніцкая рэволюцыя прынесла Аляксею Міхайлавічу радасць і шчасце. Толькі Кастрычніцкая рэволюцыя, наша комуністычная партыя большэвікоў, членам якой ён з'яўляецца з 1920 года, дала магчымасць тав. А. М. Міснікевічу стаць актыўным грамадскім дзеячом, партыйным і совецкім работнікам.

В. Стальноў.

Выбаршчыкі Вяліка-Дамброўскай выбарчай акругі № 91, Чыжаўскага раёна! 15 снежня ўсе як адзін аддавайце свае галасы за Яніну Іванаўну САДОЎСКУЮ!

★ ★ ★

Яніна Іванаўна Садоўская

(*БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС*)

Пан Гудкоўскі ўсё не верыў, што сюды, на захад, ідзе Чырвоная Армія. Але яна прышла, сустрэнутая плакаўшым ад радасці народам. Зямлю пана Гудкоўскага раздзялілі яго батракі, сялянскі камітэт раздаў панскае дабро беднякам, якія не мелі ні каровы, ні каня, ні сваёй хаты. І ўсёй гэтай справай кіраваў Ян Садоўскі—стары батрак, які многа год служыў фурманам у пана.

Пасля раздзелу зямлі і маёмасці батракі прышлі і сказалі пану:

— Прошэ пана выйсці з дому, тут бяздомных батракоў паселім, якія пад панскай ласкай жылі ў канурах.

Так выгурылі батракі пана з маёнтка і пачалі наладжваць сваё жыццё па-новаму, па-совецку, без паноў. Людзі столькі нацярпеліся крыўды і здзекаў, што цяпер яны гнеўна кідалі ў твар пану праклянцці, выліваючы шматгадовую нянавісць.

Ды як-жа інакш мог паступіць з панам старшыня сялянскага камітэта Ян Садоўскі, які служыў з сям'ёй у Гудкоўскага проста за скарынку хлеба? Бывала, паедзе пан куды ў госці і гуляе двое сутак. А стары Ян Садоўскі, панскі фурман, мусіў сядзець на двары, ці дзе пад паветкай, пільнаваць і даглядаць коней, а сам быў мокры і галодны.

У пана служыла ўся Янава сям'я. Ад цёмнага да цёмнага працавалі летні дзень за 80 грошаў ды за кілограм жыта. Летам упраўляючы ўсіх выганяў на панскае поле ды сачыў, каб кожны працаваў ад рана да позна, ды каб не марудзіў у рабоце.

Яшчэ больш строгім станавіўся пан, калі зімой батракі прыходзілі атрымліваць запрацаваны хлеб.



— Няма ўжо ў мяне хлеба,—адказваў Гудкоўскі.

Скардзіцца не было каму, ды і як скардзіцца, калі ўлада была панская, законы — панскія, суд—панскі. Глядзі—яшчэ самога абвінавацяць.

Не забудуць ніколі батракі, не забудуць навакольныя сяляне ненавіснага эксплаататара пана Гудкоўскага.

Дачка Яна—Яніна прабавала пайсці шукаць лепшага жыцця, паехала ў Варшаву. Ледзь паступіла на цукерачную фабрыку Валенскага. Працавала там з самага пачатку зімы да канца лета мінулага года. 10 і 12 гадзін у суткі гнула спіну на капіталіста, а плаціў ён 8 злотых у тыдзень. Простай работніцы не было шчасця ў сталічным польскім горадзе. Праз 7 месяцаў вярнулася яна дадому: захварэла маці. Неўзабаве-ж пачалася вайна з Германіяй, распалася польская армія, разбурылася польская дзяржава. Вось і прышла Чырвоная Армія.

Радасна сустрэлі родную вызваліцельніцу батракі.

Маладая Яніна, якая заўсёды зайздросціла дачцы ўпраўляючага, што тая вучылася, цяпер сама пайшла вучыцца. Месяц правучылася, скончыла курсы рускай мовы ў Лапах, затым у Беласток паехала на фінансавыя курсы. 10 мая яе назначаюць ужо на пасаду фінансавага агента ў Расахацкім сельсовеце. Старалася працаваць як найлепш, дакладна выконваючы совецкія законы. Палюбіла сваю работу, цалкам аддалася ёй. Затым яе перавялі ў Вяліка-Дамброўскі сельсовет. І тут яна актыўна праявіла сябе як грамадская работніца. Насельніцтва добра пазнала адданую, чэсную работніцу.

І калі ў Вялікім Дамброве сход выбаршчыкаў абмяркоўваў—каго вылучыць кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета дэпутатаў працоўных, сяляне аднадушна рашылі намеціць кандыдатуру Яніны Садоўскай, дачкі батрака, якую падняла з непрасветнага жыцця совецкая ўлада, вывела на свет, на шлях дзяржаўнай работы. Кандыдатуру тав. Садоўскай падтрымалі на ўсіх сходах выбаршчыкі Вяліка-Дамброўскай выбарчай акругі.

Яніна Іванаўна Садоўская з чэсцю апраўдае вялікае давер'е сваіх выбаршчыкаў, будзе верна служыць народу.

І. Клінаў.

Да 85-годдзя з дня смерці Адама Міцкевіча

ВЯЛІКІ ДЭМАКРАТ

Найвялікшы паэт Польшчы—Адам Міцкевіч з'яўляецца ўвасабленнем самых перадавых традыцый польскага народа, натхнёным змагаром за правы працоўных, за свабоду народаў, стагнаўшых у кайданах абсалютызма.

Гэту прагрэсіўную ролю Міцкевіча, яго адважную палітычную і публіцыстычную дзейнасць старанна хавала афіцыяльная літаратурная гісторыя і крытыка ў Польшчы. Біёграфы Міцкевіча Пётр Хмелеўскі і Іосіф Каленбах у сваіх манаграфіях усяго некалькі старонак прысвячаюць яго публіцыстычнай дзейнасці ў «Трыбуне Народаў».

Нічога дзіўнага, што Адам Міцкевіч, геніяльны паэт, вядомы як тварэц «Пана Тадэуша» і «Дзядоў», быў у буржуазнай Польшчы амаль невядомы як рэдактар «Трыбуны народаў», як аўтар страсных палітычных артыкулаў, поўных рэволюцыйнага агню і сапраўднага дэмакратызма.

Толькі ў Совецкім Саюзе, дзе постаць вялікага паэта—трыбуна-дэмакрата акружана такой пашанай,—багатая скарбніца палітычнай дзейнасці Адама Міцкевіча поўнасцю стане здабыткам найшырэйшых народных мас.

Міцкевіч, выхаваны ва ўмовах адсталага шляхецкага захалусця з яго класавымі і рэлігійнымі забабонамі, рана вырас з свайго акружэння і ўступіў на шлях прагрэса і дэмакратыі.

Шлях развіцця Міцкевіча—гэта прагрэсіўныя студэнцкія арганізацыі, арышт і ссылка царскімі ўладамі, гэта глыбокі ўплыў геройскіх дзекабрыстаў Бестужава і Рылеева, дружба з Пушкіным, а затым доўгія гады жыцця ў эміграцыі ва Францыі, у якой кіпела палітычнае жыццё.

Для Міцкевіча гэты шлях не быў лёгкі і просты. Неаднаразова бывалі на ім перыяды дэпрэсіі, у якіх пераважалі ідэі містычныя і рэлігійныя, асабліва ў момант узмацнення соцыяльна-палітычнай рэакцыі. Але калі толькі мацнеў рух народных мас, калі дзе-небудзь для справы свабоды народаў праясняўся гарызонт—Міцкевіч спяшаўся туды, каб служыць інтарэсам мільёнаў. Ідучы па гэтаму шляху, Міцкевіч усё больш звязваўся з рэволюцыйнай еўрапейскай дэмакратыяй, што з усёй яркасцю было выяўлена ў гістарычныя 1848—1849 годы.

Грамадска-палітычная сітуацыя ў тагочаснай Францыі—другой радзіме Міцкевіча — пакінула глыбокі след на поглядах вялікага паэта.

Пролетарыят Парыжа сумесна з шырокімі народнымі масамі ў рэволюцыйным паўстанні ў лютым 1848 года разбівае кайданы банкірскай манархіі Людовіка Філіпа. Але плады перамогі народа не становяцца здабыткам рабочага класа. Уладу захватвае буржуазія і хутка пераходзіць да наступлення на працоўных. Пролетарыят Парыжа на правакацыі буржуазіі адказвае ўзброеным чэрвеньскім паўстаннем: «першай вялікай бітвай паміж абодвума класамі, на якія раздзяляецца сучаснае грамадства». (Карл Маркс «Класавая барацьба ў Францыі з 1848 па 1850 гг.»).

Чэрвеньскае паўстанне было патоплена ў крыві. Народы Італіі, Германіі, Аўстрыі, Венгрыі і Польшчы, якія ў адказ на лютаўскую рэволюцыю ў Парыжы ўзнялі сцяг дэмакратычнай рэволюцыі, хутка пераканаліся, што буржуазная французская рэспубліка і не думае падтрымаць іх барацьбу. Толькі пролетарыят мог узначаліць барацьбу прыгнечаных народаў Еўропы.

«Лёс гэтых нацыянальных рэволюцый стаў залежным ад пролетарскай рэволюцыі. Знікла іх мнімая самастойнасць і незалежнасць ад вялікага соцыяльнага перавароту. Ні венгерац, ні паляк, ні італьянец не будуць свабоднымі, пакуль рабочы клас астаецца нявольнікам» (К. Маркс).

Гэта зразумелі самыя прагрэсіўныя і звязаныя з народам палякі, як гісторык Еахім Лелевель, які сумесна з Карлам Марксам быў членам праўлення «Міжнароднага дэмакратычнага таварыства ў Бруселі». Гэта інтуіцыйна адчуваў і Адам Міцкевіч. У момант, калі пасля лютаўскай рэволюцыі ўладу ў Парыжы захапіла буржуазія, а адзін з яе прадстаўнікоў у часовым урадзе, паэт Лямартэн, адкідвае патрабаванне пролетарыята прызнаць чырвоны сцяг сцягам рэспублікі — Адам Міцкевіч у пісьме Лэнцкаму з Рыма 9 сакавіка 1848 года піша: «Тое, што Лямартэн адкінуў чырвоны сцяг,—дрэнны прызнак, ён інстынктыўна ведае, што гэты сцяг азначае, і народ гэта ведае».

А калі ў чэрвені буржуазія гвалтоўна душыць паўстанне парыжскіх рабочых, Міцкевіч разумее, што паражэнне парыжскага пролетарыята — гэта адначасова паражэнне вызваленчай барацьбы польскага народа. Таму ў пісьме Клюкоўскаму 1 верасня 1848 года ён піша: «Пасля чэрвеньскіх падзей аснова нашай дзейнасці сарвалася».

Аднак, у момант, калі перамагла рэакцыя, а правадыры парыжскага пролетарыята былі арыштаваны і павінны былі прадстаць перад судом у Буржы, — Міцкевіч 15 сакавіка 1849 года піша ў «Трыбуне народаў»:

«Які-б ні быў лёс абвінавачваемых, іх прозвішчы будуць упісаны ў рады абаронцаў еўрапейскай свабоды. Калі яны страцяць свае грамадзянскія правы ў Францыі, яны здабудуць грамадзянскія правы ва ўсеагульнай рэспубліцы народаў».

Трэба было мець вялікую грамадзянскую мужнасць, каб выступіць у абарону рабочых дзеячоў, праследуемых французскай рэакцыяй. Гэта выступленне было яшчэ адным доказам шчырага і глыбокага дэмакратызма Адама Міцкевіча.

Якія-ж грамадска-палітычныя лозунгі Міцкевіча, супроць каго ён заклікае змагацца? Адказ мы знойдзем у яго артыкуле пад загалоўкам: «Ворагі народа», змешчаным у «Трыбуне народаў» 18 красавіка 1849 года. Міцкевіч піша:

«Народ, які змагаецца за сваю незалежнасць, клапоціцца аб пашырэнні сваіх свабод, мае права лічыць сваімі натуральнымі ворагамі ўсе старыя дынастыі, усіх членаў дынастый...

Гэты народ не павінен давяраць высокім саноўнікам касцёла, якія ўсе аднолькава звязаны з культам абсалютызма...

Нарэшце, ён павінен адкінуць супрацоўніцтва з арыстакратамі, асабліва з тымі, якія былі слугамі, або дарадчыкамі ўрадаў, прыгнятаючых народ...»

Свае патрабаванні і лозунгі Міцкевіч разгортвае ў так званым «Выкладанні прынцыпаў», складзеным для польскага легіёна ў Італіі.

Міцкевіч патрабуе: свабоды слова, веравызнання, роўнасці ўсіх грамадзян перад законам, выбіраемасці ўсіх пасад, роўнапраўя для яўрэяў і ўсіх народаў, якія пражываюць у Польшчы, роўнапраўя для жанчын.

Гэтыя патрабаванні глыбока дэмакратычны, накіраваны сваім вастрыём не толькі супроць еўрапейскага абсалютызма, але і супроць польскіх магнатаў, духавенства, якія хацелі ўтрымаць краіну ў цемры рэакцыі і прыгоннага гнёту, накіраваны супроць арыстакратаў, якія для сваіх класавых інтарэсаў прадавалі польскі народ.

У «Трыбуне народаў», рэдагуемай Міцкевічам у 1849 годзе на французскай мове, яго грамадска-палітычныя погляды знайшлі сваё самае поўнае і спелае выражэнне. «Трыбуна народаў» на сваіх сцягах напісала лозунгі барацьбы за дэмакратыю, за вызваленне еўрапейскіх народаў з-пад тыраніі абсалютызма.

У радзе выдатных артыкулаў Міцкевіч агітуе ў карысць патрабаванняў соцыялістаў у выбарчай кампаніі ў народнае сабранне. Да самых рэволюцыйных, найбольш блізкіх к рабочаму класу думак даходзіць Міцкевіч у такіх артыкулах, як «Утапічны соцыялізм і рэволюцыйная барацьба», «Рабочыя гарады», «Мільярд» і ў радзе іншых.

Староннікі дробна-буржуазнага і буржуазнага соцыялізма, розныя рэфарматары накшталт Косідэрана, выступаючы ў народным сабранні і сярод рабочых Парыжа, агітавалі за свае «выратоўчыя сродкі» накшталт прудонаўскіх ламбардных банкаў, узорных абшчын і т. д. замест таго, каб арганізаваць барацьбу супроць наступаючай рэакцыі.

У сувязі з гэтым Міцкевіч у артыкуле «Утапічны соцыялізм і рэволюцыйная барацьба» таворыць вялікія, поўныя рэволюцыйнага агню, яшчэ і сёння актуальныя словы:

«Лічым, што пытанні, хвалюючыя чалавецтва, патрабуюць іншых сродкаў чым іпатэчныя банкі, абаротны крэдыт, сіндыкаты працы і ўзорныя абшчыны ...Мы павінны сказаць, што ўсякая сістэма будзе толькі дарэмнай утопіяй, пакуль будзем старацца вырашыць грамадскія пытанні мірным шляхам, не чапляючы нікога. Вы прызнаеце, што існуюць толькі нявольнікі і прыгнятальнікі, афяры і каты, а хочаце даць шчасце чалавецтву, уводзячы гармонію паміж дабром і злом. Вы хочаце, каб эксплаататары адступілі перад логікай вашых доказаў, калі яны не адступілі перад самаахвярнасцю і афярамі цэлых пакаленняў...? Каб выратаваць грамадства, прапануеце іпатэчныя банкі і абшчынныя калектывы, але ідзіце ў Польшчу, і вы знойдзеце там банкі, створаныя ўжо 30 год назад, у Расіі на кожным кроку вы сустрэнеце абшчынныя калектывы, а ўсё-ж не лічыце, што становішча няшчаснага польскага селяніна або забітага падданага ў Расіі з'яўляецца гэтым ідэалам шчасця на зямлі...

Калі таворыцца аб становішчы грамадства, трэба ахапіць гарызонт значна шырэй гарызонта 38 тысяч абшчын Францыі. Гэта не толькі пытанне выключна французскае. Яно датычыцца ўсіх членаў вялікай чалавечай сям'і. Французскі народ, які ўласнымі сіламі зрабіў рэволюцыю, ведаў таксама, як трэба яе развіць».

Падкрэсліваючы, што французскі народ хацеў паспяшыць на дапамогу прыгнечаным народам Еўропы, а перашкодзіў гэтаму толькі класавы і нацыянальны эгаізм французскай буржуазіі, Міцкевіч заканчвае артыкул наступнымі словамі па адрасу «рэфарматараў» накшталт Касідэрана:

«Сёння імкнуцца павярнуць парадак гісторыі нясвоечасовыя рэфарматары, служачы, такім чынам, рэакцыі. Няхай грамадзянін Касідэран адкладзе на нейкі час сцяг міру, няхай сумесна з намі ўздыме сцяг апошняй вайны за свабоду супроць дэспатызма, і ён можа быць упэўненым, што ў дзень апошняй перамогі не знойдзе нас у радах сваіх праціўнікаў».

У гэтых палкіх словах ёсць глыбокае разуменне непраходнага бяздоння, якое дзеліць рэакцыю і прагрэс, магнатаў і народ, ёсць палкае асуджэнне буржуазных рэфарматараў і апартуністаў, якія хочуць накладваць пластыры на гніючыя раны Еўропы, ёсць рашучае выказванне за рэволюцыйную барацьбу супроць дэспатызма, за вызваленне народаў.

У гэтых словах Міцкевіч паўстае ва ўсёй велічы трыбуна рэволюцыйнай дэмакратыі. Гэта можна поўнасцю ацаніць толькі тады, калі ўспомніць, чым была тагочасная Польшча, пагружаная ў цемру рэакцыі, прыгнёту і шляхецкай адсталасці.

У артыкуле «Рабочыя гарады» Міцкевіч перасцерагае пролетарыят Парыжа ад псеўда-соцыялістычнай філантропіі капіталістаў, якая імкнецца адцягнуць рабочых ад рэволюцыйнай барацьбы.

Не ведаючы дастаткова шляхоў развіцця капіталістычнага грамадства, Міцкевіч думае, што Францыя ўжо падрыхтавана да соцыялізма і падобна ўтапістам шукае правадыра, які-б гэты соцыялізм ажыццявіў і на чале рэволюцыйнай Францыі пачаў вайну за вызваленне прыгнечаных народаў — палякаў, венграў, італьянцаў.

У гэтай справе Міцкевіч сур'ёзна памыляўся, як у самім падыходзе да пытання, так і ў падборы «правадыра», якім, па яго думцы, павінен быць Людвіг Напалеон — прэзідэнт буржуазнай Французскай рэспублікі.

Такі погляд павінен быў давесці да горкіх расчараванняў. Напалеон не толькі не думаў аб барацьбе і абароне прыгнечаных народаў, але закрыў і «Трыбуну народаў» у канцы 1849 года.

Памылковыя погляды Міцкевіча ў гэтым, як і ў радзе іншых пытанняў, выцякалі з яго ідэалістычных ілюзій, з неразумення класавага характару дыктатуры Людвіга Напалеона.


* * *

Не трэба ні на хвіліну забываць, што Міцкевіч перш за ўсё вялікі паэт, што цяжка да яго падыходзіць з меркай, з якой мы падыходзім да палітычных дзеячоў, маючых паслядоўна пабудаваную грамадска-палітычную праграму. Бясспрэчна, нямала было ўнутраных супярэчнасцей у гэтым геніяльным чалавеку, хістанняў у бок містычна-рэлігійных настрояў, якія затрудняли Міцкевічу пераход на шлях паслядоўнай рэволюцыйнай барацьбы народных мас.

Але Адам Міцкевіч — найвялікшы паэт, палкі трыбун дэмакратызма — усімі ніцямі свайго вялікага сэрца і духа быў звязан з барацьбой народа за свабоду, за лепшую будучыню. З глыбокай інтуіцыяй адчуваў ён, што гэта будучыня належыць народу.

Рэчаіснасць нашых дзён гэта поўнасцю падцвердзіла.

С. Натансон.



Семінар агіткалектыва прамысловай кааперацыі горада Гродна па пытанню аб падрыхтоўцы да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Фота А. Сапіра.

НА ВЫБАРЧЫХ УЧАСТКАХ

Лепш арганізаваць работу на ўчастках

Уваход у памяшканне акруговых выбарчых камісій №№ 179, 180, 181 і ўчастковай камісіі № 2 не асветлен. Само памяшканне маленькае, у якім ледзь два сталы змяшчаецца. Прыдзе 5—6 выбаршчыкаў — не будзе дзе і павярнуцца. Старшынёй выбарчай камісіі працуе стары кадравы рабочы-зваршчык тав. Пульны.

—Поўнасцю работу сярод выбаршчыкаў яшчэ не разгарнулі,—гаворыць ён.—Увогуле на ўчастку налічваецца 90 агітатараў, а пакуль працуюць толькі 10. З іх выдзяляюцца тав. Клімюк і камсамолка тав. Утка. Яны правялі па тры гутаркі аб Сталінскай Канстытуцыі і Палажэнні аб выбарах. На занятках у кожнай з іх прысутнічае па 15 хатніх гаспадынь. Трэба яшчэ многа і многа працаваць...

Апошняя заўвага зусім правільная. Партыйныя арганізацыі дыстанцыі № 2 і станцыі Беласток-Пасажырская, якія абслугоўваюць участак, яшчэ не аказваюць штодзённай дапамогі ў рабоце, не кантралююць работу сваіх агітатараў, не даюць ім указанняў.

Не разгорнута работа па праверцы спіскаў выбаршчыкаў. А ў спісках дапушчана многа недакладнасцей. Так, адзін грамадзянін у спіску запісан жанчынай. Агітатар тав. Клімюк, праверыўшы, ці ўсе яе гуртkоўцы занесены ў спісак, выявіла, што ў спісак не ўнесена 9 чалавек, маючых права голасу. Па астатніх дамах і вуліцах праверка яшчэ не праведзена.

Старшыня ўчастковай камісіі тав. Пульны лічыць, што праверку спіскаў павінны рабіць агітатары, што іх трэба ў гэтай справе падварушыць. Даверaны-ж 179 акругі тав. Дышлідаў лічыць, што ў праверку спіскаў павінны ўключацца і члены акруговых і ўчастковай выбарчых камісій.

Да дня выбараў астаўся зусім кароткі тэрмін. Агітацыйная работа на выбарчых участках павінна быць разгорнута поўнасцю. Усе агітатары, члены выбарчых камісій павінны быць штодзённа на ўчастку, весці работу сярод выбаршчыкаў. Гэтага пакуль няма на выбарчым Некрасаўскім участку № 2.

Г. Кузняцоў.

Работа яшчэ не разгорнута

Авіяцыйны выбарчы ўчастак № 2 4-й Совецкай выбарчай акругі (гор. Беласток) афармлен нядрэнна. У памяшканні ўчастка ёсць партрэты правадыроў партыі і ўрада, кветкі, плакаты. На стале — выбарчая літаратура на рускай, польскай і беларускай мовах. На жаль, зусім адсутнічае літаратура на яўрэйскай мове, хоць на ўчастку вялікі процант яўрэйскага насельніцтва.

У спісках выбаршчыкаў налічваецца зараз 1.352 чалавекі. Як заявіў сакратар участковай камісіі тав. Райко, агульны лік выбаршчыкаў складзе 1.500 чалавек. У спісках-жа, атрыманых ад горвыканкома, ёсць многа пропускаў. Жыхары дамоў №№1 і 13, па вуліцы Талстога, былі зусім прапушчаны. Па некалькі чалавек прапушчана таксама з ліку грамадзян, пражываючых па вуліцы Талстога, 4, Совецкай вуліцы, 6 і іншых дамах участка.

Участак абслугоўваюць партарганізацыі беластоцкага лесазагатоўчага трэста Когіз'а. Яны вылучылі 22 агітатары, але агітацыйная работа на ўчастку да гэтага часу яшчэ не разгорнута.

Да гэтага часу не наладжана агітацыйна-масавая работа сярод хатніх гаспадынь, якія пражываюць па вуліцы Надрэчнай, 12. Жыхары дома па вуліцы Талстога, 8 не ведаюць нават, дзе знаходзіцца іх выбарчы ўчастак.

Мы гутарылі з некалькімі выбаршчыкамі. Як аказалася, агітатары нават не лічылі патрэбным запрасіць іх у памяшканне ўчастка. Нічога дзіўнага, што на ўчастку выбаршчыкі пакуль не бываюць.

Да выбараў асталося мала часу. Узмацніць агітацыйную работу сярод выбаршчыкаў, дабіцца таго, каб выбаршчыкі былі ахоплены большэвіцкай агітацыяй—вось задача цяперашняга этапа выбарчай кампаніі.

В. Бемаў.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

Агітацыйна-масавая работа на выбарчых участках

Партарганізацыя горада Беластока разгарнула шырокую масава-палітычную работух (на выбарчых участках. Агітатары, вылучаныя пярвічнымі партарганізацыямі, праводзяць гутаркі з выбаршчыкамі на адведзеных ім участках. Многія з іх ужо правялі па 2—3 гутаркі аб тэхніцы галасавання, растлумачылі Палажэнне аб выбарах.

Добра пастаўлена агітмасавая работа на выбарчым участку № 10, да якога прымацавана партарганізацыя абласнога ўпраўлення міліцыі. Тут для правядзення агітацыйнай работы вылучылі 59 агітатараў, якія арганізавалі 10 гурткоў. Гурткамі ахоплена 132 выбаршчыкі. Акрамя заняткаў у гуртках з некаторымі выбаршчыкамі праводзяць індывідуальныя гутаркі.

Пярвічная партарганізацыя абласнога суда прымацавана да 6-га выбарчага ўчастка. Для правядзення работы з выбаршчыкамі выдзелена 36 агітатараў. На ўчастках працуюць 18 гурткоў па вывучэнню Палажэння аб выбарах. Вылучаныя агітатары правялі па некалькі заняткаў.

Партарганізацыя 17-й тэкстыльнай фабрыкі таксама разгарнула вялікую агітацыйна-масавую работу як на выбарчым участку, так і на фабрыцы. Тут працуе 26 агітатараў. Кіруе агіткалектывам тав. Матвееў. Агітатарам дадзена неабходная літаратура для правядзення агітработы.

Побач з станоўчай работай ёсць і такія партарганізацыі, якія яшчэ не разгарнулі як след агітацыйна-масавую работу на выбарчых участках. Да такіх можна аднесці партарганізацыю 1-га тэкстыльнага камбіната (сакратар тав. Новікаў), аблвыканкома (сакратар тав. Селецоў), плюшавай фабрыкі (сакратар тав. Ермалаева), аблмаслапрома (сакратар тав. Сінотаў). Гэтыя партарганізацыі замест разгортвання агітмасавай работы абмежаваліся толькі вылучэннем агітатараў.

Старшынёй участковай камісіі выбарчага ўчастка імені Міцкевіча зацверджана работніца 6-га тэкстыльнага камбіната тав. Дзінабургская. Яна энергічна ўзялася за работу. Складзен план работы, за гэты час праведзена тры пасяджэнні ўчастковай камісіі, устаноўлены штодзённыя дзяжурствы на ўчастку, вывешаны спіскі выбаршчыкаў і зроблена вітрына з літаратурай па выбарах у мясцовы Совет дэпутатаў працоўных. Выпушчана насценная газета. З выбаршчыкамі ўчастка праведзен вечар з дакладам аб XXIII гадавіне Кастрычніцкай рэвалюцыі і аб задачах выбаршчыкаў у час выбараў. У памяшканні выбарчага ўчастка вывешаны лозунгі і плакаты, прысвечаныя выбарам.

Гарадскі камітэт партыі заслухаў на бюро сакратароў пярвічных партарганізацый 6-га тэкстыльнага камбіната тав. Рубінштэйн, 1-га тэкстыльнага камбіната тав. Новікава, плюшавай фабрыкі і аблвыканкома аб становішчы масава-палітычнай работы на выбарчых участках.

С. Кубышкіна,
Р. Кісельман.

Справаздача аб рабоце газеты на пасяджэнні райкома

ГРАЕВА. (**Ад нашага карэспандэнта**). Нядаўна адбылося пасяджэнне райкома партыі. На пасяджэнні разбіралася пытанне аб удзеле друку Граеўскага раёна ў выбарчай кампаніі. Рэдактар раённай газеты «Новае жыццё» тав. Васільеў і загадчык аддзела прапаганды і агітацыі райкома тав. Цараў далажылі райкому аб рабоце газеты «Новае жыццё» і рэдкалегій насценных газет. Выступіўшыя затым у спрэчках дапоўнілі дакладчыка і ўскрылі рад істотных недахопаў у рабоце раённай газеты.

Газета «Новае жыццё» выходзіць ужо другі год. Але яе старонкі ўвесь час запаўняюць штатныя работнікі рэдакцыі. Так за год у ёй удзельнічалі толькі 35 пазарэдакцыйных аўтараў. Газета на сваіх старонках дрэнна асвятляе жыццё раёна. Асобныя нумары газеты выпускаліся з вялікай колькасцю граматычных памылак, якія іншы раз перарасталі ў палітычныя памылкі.

Яшчэ горш кіравала рэдакцыя газеты работай насценных газет. Актыва рабселькораў у рэдакцыі няма. За прайшоўшы тэрмін не было праведзена ніводнай нарады членаў рэдкалегій насценных газет і рабселькораў. І не дзіўна, што ў рэдакцыі не ведаюць, колькі па раёну выпускаецца насценных газет. Рэдакцыя змяшчаецца ў неабсталяваным, дрэнным памяшканні. Не ўкамплектавана работнікамі. Зараз няма карэктара, машыністкі.

Райком партыі недастаткова ўнікаў у работу рэдакцыі, недастаткова кіраваў яе работай. Партыйны актыў у газеце мала дапамагае сваім удзелам у ёй. Артыкулы кіраўнікоў раёна на старонках газеты паяўляюцца рэдка.

Райком партыі, абмеркаваўшы справаздачу рэдактара, прыняў рашэнне, у якім намеціў рад мерапрыемстваў па ўдзелу у выбарчай кампаніі, і прапанаваў рэдакцыі неадкладна распрацаваць план масавай работы.

В. Гарбанёў.



Засыпка насеннай бульбы для зімняга захоўвання ў калгасе імені Сталіна (Ружанскі раён, Брэсцкай вобласці).
Фота В. Лупейка. Фотахроніка БЕЛТА.

Як змагацца са шкоднікамі збожжа ў зімовы перыяд

Барацьба са шкоднікамі запасаў зярна ў халодны час года можа праводзіцца шляхам скарыстання нізкай тэмпературы, а таксама розных парашкападобных хімічных вяшчэстваў. Тэмпературныя ўмовы з'яўляюцца адным з важных фактараў, пры якіх абумоўлена развіццё свірнавых шкоднікаў. Так, напрыклад, па даных Радзіонава, кляшчы лепш за ўсё размнажаюцца пры тэмпературы ад 18,8 да 23,9 градусаў па Цэльсію. Пры гэтых умовах наглядаецца адкладка кляшчамі вялікай колькасці яек і хутчэйшае іх развіццё. Пры тэмпературы 5 градусаў Цэльсія і ніжэй кляшчы не размнажаюцца. Мною на працягу апошніх двух год у інстытуце біялогіі Акадэміі навук БССР былі пастаўлены вопыты ў вытворчых умовах па вывучэнню ўплыву ахаладжвання насення на развіццё свірнавых шкоднікаў. Для гэтай мэты было ўзята насенне жыта, аўса з нармальным процантам вільготнасці і пры халодным сухім надвор'і (25—30 градусаў Цэльсія) і прапушчана праз ВІМ — 2 і сепаратары. У ахаладжаным насенні сістэматычна праводзілася вымярэнне тэмпературы, вызначэнне ўсхожасці і заражонасці насення свірнавымі шкоднікамі. У выніку правядзення вопытаў было ўстаноўлена, што ў ахаладжаным насенні адмоўная тэмпература для развіцця кляшчэй захоўваецца да пачатку сяўбы. Акрамя гэтага ў такім насенні не наглядалася зніжэння ўсхожасці. Пры наступленні халоднага сухога надвор'я насенне з нармальным процантам вільготнасці неабходна прапусціць праз зернеачышчальныя машыны і злажыць для зімовага захавання.

У гэтым годзе ў некаторых калгасах, соўгасах збожжа мае павышаную вільготнасць. За такім збожжам неабходна ўстанавіць пільны догляд. Неабходна сістэматычна змяраць тэмпературу. Пры павышэнні тэмпературы збожжа трэба ахаладзіць шляхам прапускання яго праз зернеачышчальныя машыны пры халодным сухім надвор'і. Побач з гэтым вялікая ўвага павінна быць звернута на праветрыванне складскога памяшкання. Праветрываць яго неабходна ў сухое халоднае надвор'е. У часе захавання збожжа кожны кладаўшчык павінен удзяляць вялікую ўвагу правядзенню ў свірне неабходных санітарна - гігіенічных мерапрыемстваў. Неабходна сістэматычна ўдаляць і знішчаць збіраючаеся смецце з пылам і павуціннем. Нельга дапускаць захавання ў свірне з насеннем адыходаў, атрыманых у часе ачысткі збожжа. Пры ўваходзе ў складское памяшканне неабходна мець венікі і шчоткі для ачысткі вопраткі і абутку.

З парашкападобных хімічных вяшчэстваў для барацьбы з свірнавымі шкоднікамі ў насенных фондах ужываюцца нафталін і адмучаная крэйда. Ужываць нафталін можна для тых насенных фондаў, насенне якіх мае добрую ўсхожасць і нармальны процант вільгаці; для збожжавых (жыта, пшаніца, авёс, ячмень) не звыш 14—15 процантаў, для ільну — 13 процантаў. Прадназначанае для апылення нафталінам насенне павінна належным чынам ачышчацца на зернеачышчальных машынах. Толькі пасля вызначэння ўсхожасці, вільготнасці і чыстаты насення праводзіцца нафталізацыя супроць свірнавых шкоднікаў. На адну тону насення бярэцца 250—500 грамаў нафталіну. Нафталін расціраецца ў дробны парашок, роўнамерна раскідваецца па паверхні насення і перамешваецца. Апудрываць крэйдай магчыма насенныя фонды аўсу і ячменю, якія добра ачышчаны і маюць нармальную ўсхожасць і вільготнасць. На адну тону насення бярэцца 3—5 кілограмаў адмучанай крэйды. Для лепшага і хутчэйшага апылення можна ўжываць машыны, якія скарыстоўваюцца для сухога пратручвання насення.

Калгасы і соўгасы павінны зараз прыняць усе меры да таго, каб забяспечыць добраякаснае захаванне насенных фондаў. Трэба памятаць, што ад правільнага захавання насення залежыць яго якасць.

А. Маркавец,
кандыдат біялагічных навук.

НА МІЖНАРОДНЫЯ ТЭМЫ

Проціпаветраная абарона Лондана

Пасля захвату германскімі войскамі Даніі і Нарвегіі базы германскай авіяцыі надзвычай наблізіліся да Лондана. Заняцце германскімі войскамі Бельгіі і паўночна-заходняга ўзбярэжжа Францыі пагоршыла гэта становішча. У выніку проціпаветраная абарона Лондана павінна была змяніцца.

Цэнтральнае месца ў сістэме проціпаветранай абароны (ППА) Лондана займаюць актыўныя сродкі, у першую чаргу знішчальная авіяцыя і шматлікія батарэі зенітнай артылерыі. Апрача таго Лондан прыкрыт з паветра сотнямі аэрастатаў заграджэння.

На аэрадромах вакол Лондана, на шляхах галоўных напрамкаў магчымых налётаў германскай авіяцыі размешчаны шматлікія **знішчальныя эскадрыллі.**

Аддегласць ад германскіх авіябаз да Лондана зараз вельмі невялікая; англійскія знішчальнікі маюць нямнога часу, каб падняцца ў паветра і сустрэць праціўніка, калі ён пералятае «перадавую лінію ППА».

У сувязі з гэтым група англійскіх знішчальнікаў нясе ахову ў паветры, на галоўных напрамках да Лондана і над морам. Скарыстоўваючы перавагу ў скорасці, гэтыя самалёты павінны атакаваць з тыла германскія самалёты, якія накіроўваюцца да Лондана, або прыняць удзел у праследванні германскіх самалётаў, якія вяртаюцца пасля налёту на Лондан.

Прарваўшыся праз «перадавую лінію ППА», германскія самалёты сустракаюць на сваім шляху таксама эскадрыллі англійскіх аднамясцовых знішчальнікаў-перахватчыкаў, якім прыходзіцца весці бой ужо на самых подступах да Лондана або непасрэдна над яго тэрыторыяй.

Разам са знішчальнай авіяцыяй атакі германскіх самалётаў адбівае **зенітная артылерыя.** Шматлікія батарэі зенітнай артылерыі размешчаны вакол Лондана і ў самым горадзе на плошчах, у парках, скверах і іншых зручных для дзеянняў зенітнай артылерыі месцах.

Па вестках германскага друку, англічане прымяняюць зенітныя гарматы буйных і дробных калібраў, а таксама 40-міліметравыя аўтаматычныя зенітныя гарматы «Бофорс» і зенітныя кулямёты. Сярод цяжкіх зенітных гармат, абараняючых Лондан, ёсць 102-і і 120-міліметравыя гарматы «Вікерс», якія могуць страляць на вышыню да 12.500 — 13.200 метраў. Гэтыя гарматы прымушаюць германскія самалёты трымацца на вялікай вышыні і губляць з прычыны гэтага дакладнасць прыцэльвання.

Калі ўступаюць у дзеянне англійскія знішчальнікі, зенітная артылерыя па папераджальнаму сігналу камандзіра знішчальнікаў (за 10—20 секунд да пачатку атакі знішчальнікаў) спыняе свой агонь. Зенітчыкі аднаўляюць агонь таксама па сігналу камандзіра знішчальнікаў.

Узаемадзеянне зенітнай артылерыі са знішчальнай авіяцыяй — справа вельмі складаная, і англійскае камандаванне надае яму вялікае значэнне. У асаблівасці цяжка ажыццяўляць гэтае ўзаемадзеянне ў начны час. Непрыяцельскі-ж самалёт толькі на вельмі кароткі тэрмін пападае ў прамені пражэктара, і трэба адрозніць самалёты праціўніка ад сваіх. У сувязі з гэтым ноччу англійская зенітная артылерыя і знішчальная авіяцыя ў адным і тым-жа раёне сумесна не дзейнічаюць.



Аэрастат паветранага заграджэння ў Англіі. Фота ТАСС.

Вялікую ўвагу англічане ўдзяляюць службе паветранага нагляду, апавяшчэння і сувязі. Сетка пастоў размешчана не толькі на ўзбярэжжы, але і на моры, дзе нагляд вядзецца на спецыяльных суднах. Над морам патрулююць спецыяльныя самалёты.

Дзякуючы добрай арганізацыі англійскай службы нагляду і апавяшчэння, германскім самалётам у большасці выпадкаў не ўдаецца рабіць раптоўныя налёты на Лондан.

Вялікае значэнне ў проціпаветранай абароне Лондана маюць **аэрастаты** заграджэння. Перавагі аэрастатаў заграджэння відавочны, яны ва ўсякі час дня і ночы «гатовы да бою», і калі яны ўжо знаходзяцца ў паветры, то ніякага дадатковага часу для падрыхтоўкі іх у момант налёту германскіх самалётаў не патрабуецца. Частыя туманы і нізкая воблачнасць над тэрыторыяй Лондана садзейнічаюць маскіроўцы аэрастатаў заграджэння і даюць магчымасць прымяняць іх не толькі ноччу, але і днём.

Па даных англійскага друку, Лондан у канцы 1939 года меў 10 атрадаў аэрастатаў заграджэння (кожны атрад па 50 аэрастатаў заграджэння). Англічане прымяняюць аэрастаты заграджэння, якія маюць балон аб'ёмам у 625 кубічных метраў. Напаўненне аэрастата газам займае 20 мінут, пад'ём аэрастата на баявую вышыню (2—3 тысячы метраў) працягваецца ў сярэднім 10—15 мінут.

Такім чынам атрад у 50 аэрастатаў заграджэння пасля прыбыцця ў новы пункт можна праз 30—45 мінут нечакана для праціўніка наладзіць заграджэнне на новым напрамку.

Найбольшы эфект аэрастаты заграджэння даюць ноччу, а таксама ў туманныя і воблачныя дні, калі атакуючыя самалёты не бачаць аэрастата, не могуць збіць яго, затое самі рызыкуюць наткнуцца на лінію заграджэння.

Ноччу англійскія пражэктары час-ад-часу асвятляюць аэрастаты заграджэння для маральнага ўздзеяння на лётчыкаў праціўніка. Як паведамляе замежны друк, германскія лётчыкі, ведаючы аб наяўнасці аэрастатаў заграджэння над даным раёнам, ухіляюцца ад заданага напрамку і вымушаны скідваць бомбы з вялікай вышыні. Апошняе, вядома, зніжае эфектыўнасць пападання ў цэль.

Найбольш паражальны аэрастаты заграджэння для праціўніка ў ясныя бязвоблачныя дні. Звычайна германскія знішчальнікі нападаюць на аэрастаты заграджэння ў адзіночку або асобнымі атрадамі досвіткам ці пры змярканні і кулямётным абстрэлам з невялікай адлегласці запальваюць іх.

У «барацьбе за Лондан», якая пачалася ў ліпені 1940 года, германская авіяцыя перыядычна мяняла сваю тактыку.

У ліпені — жніўні германская авіяцыя рабіла налёты невялікімі групамі самалётаў, ахватваючы значную тэрыторыю Англіі. Мэта гэтых налётаў заключалася ў вывучэнні тэатра вайны і разведцы сістэмы англійскай проціпаветранай абароны.

У выніку асобных налётаў на аэрадромы і аб'екты ў самым Лондане немцы к пачатку верасня выявілі слабыя бакі начной ППА Лондана. Выявілася малая магутнасць пражэктараў англійскай ППА, бо дым ад пажараў аслабляў сілу асвятлення; выявіліся таксама недахоп зенітных батарэй і слабасць іх агню, невялікая вышыня пад'ёму аэрастатаў заграджэння.

Вывучыўшы слабыя бакі проціпаветранай абароны Лондана, германская авіяцыя з пачатку верасня перайшла да масавых начных атак на сталіцу Англіі.

Самая буйная бамбардыроўка Лондана адбывалася ў ноч на 8 верасня. На працягу амаль 8 гадзін 700 самалётаў (звеннямі ў 3—7 самалётаў) няспынна скідвалі бомбы на Лондан.

Вялікія разбурэнні прынеслі Лондану бамбардыроўкі 10, 11 і 16 кастрычніка. 16 кастрычніка, напрыклад, германская авіяцыя скінула на Лондан, па германскіх вестках, тысячу тон бомб.

У апошні час, у сувязі з узмацненнем проціпаветранай абароны Англіі, у прыватнасці Лондана, і ўзмацніўшайся актыўнасцю англійскай авіяцыі, германскія паветраныя сілы змянілі тактыку нападаў на Лондан. Дзённыя налёты на Лондан праводзяць нямецкія двухматорныя знішчальнікі «Месершмідт-110». Для начных налётаў скарыстоўваюцца цяжкія бамбардыроўшчыкі, якія бяруць буйныя авіябомбы за лік скарачэння запаса гаручага.

Прымяненне днём знішчальнікаў «Месершмідт-110» сведчыць аб павышэнні якасці англійскай проціпаветранай абароны. Як відаць, англійскія аднамясцовыя знішчальнікі наносяць у дзень адчувальныя страты германскім бамбардыроўшчыкам. Каб знізіць свае страты, германскае камандаванне адмовілася ад частых дзённых бамбардыровак Лондана.

У апошні час дзякуючы дапамозе з Амерыкі актыўнасць англійскай авіяцыі ўзмацнілася. Некалькі павысілася таксама якасць проціпаветранай абароны Лондана.

Палкоўнік А. КАНАНЕНКА.

АНГЛА-ГЕРМАНСКАЯ ВАЙНА

Англійскія паведамленні

ЛОНДАН, 21 лістапада. (ТАСС). Як афіцыяльна паведамляецца, учора ўдзень германскія самалёты скінулі некалькі бомб у графства Кент. Урон і колькасць ахвяр нязначныя.

У ноч на 21 лістапада авіяцыя праціўніка праяўляла вялікую актыўнасць. Бомбы былі скінуты ў раёне Лондана, у цэнтральных раёнах краіны і ва многіх пунктах паўднёвай часткі Англіі. Бамбардыроўцы падвергліся таксама адзін з пунктаў паўночна-заходняй Англіі і паўднёвы Уэльс. У радзе гарадоў цэнтральнай Англіі ўспыхнулі пажары. Фугаснымі бомбамі знішчана некалькі жылых дамоў і пашкоджаны іншыя будынкі. Маюцца забітыя і раненыя. У іншых раёнах Англіі, не гледзячы на прычынены ўрон, колькасць забітых і раненых нязначна.

ЛОНДАН, 21 лістапада. Агенцтва Рэйтэр перадае, што ў ноч на 21 лістапада англійская авіяцыя падвергла моцнай бамбардыроўцы адну сартыровачную таварную станцыю ў Германії. Бомбы былі скінуты таксама на рад аэрадромаў на акупіраванай Германіяй тэрыторыі і базу падводных лодак у Лорыяне.

(ТАСС).

—o—

Канферэнцыя рабочых арганізацый у Кавентры

ЛОНДАН, 21 лістапада. (ТАСС). 22 лістапада совет трэд-юніёнаў Кавентры склікае канферэнцыю рабочых арганізацый для абмеркавання пытанняў, звязаных з вынікамі масавага налёту германскай авіяцыі на Кавентры. Старшыня совета трэд-юніёнаў Кавентры Уэрмен заявіў, што насельніцтва патрабуе добрых сховішчаў з мінімумам выгод, а таксама расшырэння сеткі грамадскага харчавання. Уэрмен сцвярджаў, што існуючая колькасць перасовачных харчовых пунктаў недастаткова. Совет трэд-юніёнаў прадпрыме крокі супроць тых фірм, якія ўсё яшчэ адмаўляюцца пад рознымі прадлогамі выплачваць рабочым заработную плату. Канферэнцыя абмяркуе ўсе пытанні, якія звязаны з перабраскай рабочай сілы, транспартам і арганізацыяй харчавання на прадпрыемствах.

—o—

Амерыканскія лётчыкі аб самалётах, якія прыбылі з ЗША ў Англію

НЬЮ-ЙОРК, 20 лістапада. (ТАСС). Газета «Нью-Йорк таймс» змяшчае паведамленне Лонданскага карэспандэнта Уайта, у якім гаворыцца, што ён гутарыў з амерыканскімі добраахвотнікамі, знаходзячыміся ў саставе англійскіх паветраных сіл у так званай «Арлінай эскадрыллі». Амерыканцы заявілі карэспандэнту, што многія самалёты, прыбыўшыя з ЗША ў Англію, з'яўляюцца нездавальняючымі, з прычыны таго, што іх шасі не прыстасаваны для пасадкі на няроўныя пасадачныя пляцоўкі, а таксама з прычыны таго, што самалёты недастаткова ўзброены. Уайт паведамляе, што некаторыя лётчыкі з «Арлінай эскадрыллі» не маюць вопыту.

ІТАЛА-ГРЭЧАСКАЯ ВАЙНА

Зводка камандавання грэчаскай арміі

АФІНЫ, 21 лістапада. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне грэчаскай арміі перадала ўчора наступную зводку: «У раёне Корчы грэчаскія войскі дабіліся новых поспехаў. Заняўшы вышыні гары Морава, яны прасунуліся па яго заходніх атлогах. Наша авіяцыя паспяхова бамбардыравала аэрадром у Аргіракастроне і падвергла бамбардыроўцы і кулямётнаму абстрэлу адступаючыя калоны праціўніка. Італьянская авіяцыя бамбардыравала два горада ў Эпіры і Фесаліі. Маецца некалькі забітых і раненых».

Амерыканскія паведамленні

НЬЮ-ЙОРК, 21 лістапада. (ТАСС). Па паведамленнях амерыканскага друку, англійская авіяцыя збіла над Албаніяй 8 італьянскіх самалётаў. Італьянскія войскі адступаюць на двух фронтах на Албана-грэчаскай граніцы. Праследуемыя грэкамі, яны адходзяць удоўж узбярэжжа Іонічаскага мора ў напрамку на Коніспаліс. Грэчаскія войскі знаходзяцца ў трох мілях ад Корчы. Горад і дарогі, па якіх следуюць італьянцы, падвяргаюцца ўзмоцненай бамбардыроўцы.

У раёне Корчы знаходзіцца ад 300 да 400 італьянскіх самалётаў. Не гледзячы на перавагу італьянскіх паветраных сіл, грэчаскія і англійскія самалёты ўчора некалькі раз бамбардыравалі Корчу. Ваенныя транспарты італьянцаў пакідаюць горад.

Грэчаскія войскі прарваліся ў 5 пунктах лініі на фронце Корчы і акружылі частку італьянскіх войск. Італьянская лінія на паўднёвым фронце таксама прарвана. Італьянцы адступаюць да Аргіракастрона. Англійскае камандаванне ваенна-паветраных сіл паведамляе, што лётчыкі збілі за апошнія 24 гадзіны 11 самалётаў праціўніка. Відавочцы перадаюць, што пачынаючы з 2 лістапада, італьянцы бесперапынна бамбардыруюць Корфу.

НЬЮ-ЙОРК, 20 лістапада. (ТАСС). Па паведамленню «Нью-Йорк таймс», грэчаска-англійскія корпусы пранікл за італьянскую лінію ў раёне паміж Леўковікі і Аргіракастронам. Пяць італьянскіх дывізій адступаюць. Перадавыя грэчаскія часці пранікл за дарогу Корча-Леўковікі; дзве калоны войск наступаюць на Аргіракастрон, хаця знаходзяцца на вялікай адлегласці ад яго. Адна калона, наступаючая на Аргіракастрон, акружае не менш 4 італьянскіх батальёнаў. Як перадаюць, грэкі знаходзяцца ў двух кілометрах ад Корчы. Дарога на Эрсеке перарэзана, дарога на Поградзец знаходзіцца пад бесперапынным артылерыйскім абстрэлам. Дзесяткі італьянскіх ваенна-транспартных самалётаў перакідвалі ўчора падмацаванні ў Корчу.



Захват горада Эрсеке

Афіны, 21 лістапада. (ТАСС). Як паведамляе газета «Пройа», часці грэчаскай арміі захапілі пры падтрымцы грэчаскай і англійскай авіяцыі горад Эрсеке.

Эвакуацыя французаў з Латарынгії

КЛЕРМОН-ФЕРАН, 21 лістапада. (ТАСС). Агенцтва Гавас перадае, што прадстаўнік французскага міністра замежных спраў у Парыжы дэ Брынон перадаў Лавалю паведамленне начальніка грамадзянскага ўпраўлення Латарынгії Бюркеля аб тым, што эвакуацыя французскага насельніцтва з дэпартамента Мозель (Латарынгія) спыняецца 21 лістапада.

УЗМАЦНЕННЕ ВАЕННА-МАРСКОЙ АВІЯЦЫІ ЗША

НЬЮ-ЙОРК, 21 лістапада. (ТАСС). Як паведамляе газета «Нью-Йорк геральд трыбюн», марскі міністр ЗША Нокс заявіў, што марское міністэрства прыняла новы самалёт, пабудаваны авіяцыйнай фірмай Воут-Сікорскі, здольны развіваць хуткасць звыш 400 міль у гадзіну.

У снежні—студзені, працягваў Нокс, будуць укамплектаваны 6 дывізіёнаў ваенна-марскіх рэзерваў, якія будуць размешчаны на нядаўна закупленых дапаможных суднах. 1.200 чалавек праходзяць абучэнне ў Канціко (штат Віргінія) у школе марскіх афіцэраў.

Абвяржэнне паведамленняў аб перагаворах паміж Таі з Англіяй і ЗША

ТОКІО, 21 лістапада. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Домей Цусін, дыпламатычная місія Таі ў Токіо афіцыяльна абвяргае паведамленні аб перагаворах Таі з Англіяй і ЗША аб заключэнні сакрэтнага пакта. У абвяржэнні ўказваецца, што тэтыя паведамленні ні на чым не асноваваны».

ПЕРАД ЮБІЛЕЕМ ВЯЛІКАГА ПАЭТА АДАМА МІЦКЕВІЧА

Набліжаецца 26 лістапада — дзень юбілея вялікага польскага паэта Адама Міцкевіча. Паўсюды, у Беластоку і раёнах, праводзяцца даклады, падрыхтоўваюцца ўрачыстыя вечары, прысвечаныя памяці паэта.

Даклад на тэму «Міцкевіч і Пушкін» прачытаў у беластоцкім Доме пісьменніка крытык тав. Марк. Беларускі паэт, дэпутат Вярхоўнага Совета СССР, тав. Пестрак выступаў у Гродне з дакладам аб жыцці і дзейнасці Міцкевіча. Рад дакладаў у Беластоку і раёнах прачытаў пазаштатны лектар Беластоцкага абкома партыі тав. Вольпе. Намечана таксама правядзенне дакладаў на радзе выбарчых участкаў.

Дзейна рыхтуюцца да юбілея навучальныя ўстановы. 30 лістапада ў Беластоцкім педінстытуце адбудзецца вечар, прысвечаны Міцкевічу. Урачыстыя вечары, прысвечаныя памяці паэта рыхтуюць Аўгустоўская польская школа № 1, Ломжынская яўрэйская школа № 7 і рад іншых школ нашай вобласці.

Цікавы вечар адбудзецца 24 лістапада ў зале педвучылішча для настаўнікаў беластоцкіх школ. У праграме даклады таварышоў Вольпе і Навацкага аб Міцкевічу і дэкламацыі лепшых твораў паэта ў выкананні артыстаў польскага тэатра. Яўрэйскі паэт тав. Гелер прачытае свае ўласныя пераклады «Крымскіх сонетаў» Міцкевіча на яўрэйскую мову.

—o—

Радасна працаваць на карысць народа

Пяць месяцаў таму назад мы скончылі Мінскую зубаўрачэбную школу і прыехалі на работу ў Беластоцкую вобласць.

Мы гардзімся тым, што партыя і ўрад давяраюць нам клопаты аб здароўі працоўных — самага каштоўнага капітала ў нашай краіне. Нас радуе, што з кожным днём паляпшаецца медыцынскае абслугоўванне працоўных вызваленых абласцей. У горадзе Сокалы, Лапскага раёна, адкрыта новая бальніца, такая-ж бальніца будзе адкрыта ў горадзе Лапы.

Для паляпшэння нашай работы мы заключылі соцдагаворы, якія з чэсцю выконваем. Зараз мы ўключыліся ў актыўную работу па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Перад намі, маладымі спецыялістамі, радасная работа на карысць народа.

Урачы **С. Гародзішч і С. Элькіна.**

—o—

СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРЧЫ СХОД МОПРАЎСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ

У педінстытуце адбыўся справаздачна-выбарчы сход мопраўскай арганізацыі. Прысутнічала 92 члены МОПР'а. На сходзе заслухана справаздача сакратара ячэйкі МОПР, пасля чаго разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі.

Выкладчыца французскай мовы тав. Гефон абавязалася штомесячна адлічаць 5 працэнтаў свайго заработку ў фонд МОПР'а.

Сход паслаў прывітальную тэлеграму тав. Ракошы.

Х. Манеля.



Сход піонерскага актыва 5-й няпоўнай сярэдняй школы гор. Аўгустова аб выніках соцыялістычнага спаборніцтва паміж атрадамі.

Фота А. Сапіра.

КІНО

„Беспасажніца“

На экране беластоцкага кінотэатра «Спартак» дэманстрыруецца класічны фільм «Беспасажніца». Акрамя высокай мастацкай сілы, фільм па свайму зместу з'яўляецца каштоўным дакументам аб капіталістычных устоях, воўчых законах грамадства дарэвалюцыйнага часу. Аўтар сюжэта А. Астроўскі з незвычайнай выразнасцю паказаў цэлы рад тыпаў сучаснага яму грамадства і агаліў іх звярыныя норавы, бесчалавечнасць, дзікую прагнасць да нажывы.

Беластоцкі гледач, у якога зусім яшчэ свежы ў памяці жахі капіталізма, глядзіць сёння «Беспасажніцу» з уздыхам аблягчэння. Хіба адзінкавымі былі выпадкі тут, у былой панскай Польшчы, калі працоўнаму было цяжарам яго ўласнае дзіцё: расце дачка, скора замуж пара, а пасагу няма. Мясцовыя жыхары могуць прывесці шмат прыкладаў, калі з-за якіх-небудзь поўсотні рублёў не мог адбыцца шлюб, або прыгожую маладую дзяўчыну выдавалі замуж за ўрода, за старога—абы толькі быў багаты.

Перад гледачом праходзяць праўдзівыя кадры фільма. Мы бачым паміраючую Ларысу Дзмітрыеўну. Яе нежнае і гібкае цела вісне на цяжкі ланцуг, які апаясвае бетаніраваныя калоны купецкага дома. Дзяўчына дзякуе навязчывага Карандышава за забойства—адзіны выхад, які астаўся ёй. Гэты кадр з ланцугом вырастае ў сімвал. У ім жудасная рэчаіснасць, дзе пануе капітал, дзе чалавека скоўваюць ланцугі—аковы сваволля і гнёту.

Чырвоная Армія прынесла шчасце сваім адзінакроўным братам—працоўным Заходняй Беларусі. Канулі ў нябыт капіталістычнае прыгнечанне і яго воўчыя законы, у тым ліку — клопаты аб пасагу.

Еф. Барнасус.

Вечар самадзейнасці ў 14-й школе

Пасля бацькоўскага схода ў 14-й беластоцкай сярэдняй школе быў наладжан цікавы паказ вучнёўскай мастацкай самадзейнасці.

У арыгінальна задуманым мантажы «Ноч у казачнай станіцы» у пачатку была выканана грузінская народная песня «Суліко». Сола спявала вучаніца 7-га класа Брэйтбарт. Цікавымі былі выступленні вучаніц Гайдамак, Жукоўскай і Кон. Вучаніца 7 класа Шляпач прадэкламіравала вершы аб Грузіі. Мантаж закончыўся артыстычным выкананнем лезгінкі, у якім вылучыліся вучаніцы Брэйтбарт і Рубіна.

Не менш цікавымі былі спартыўныя нумары, дэкламацыя і т. д.

Вечар самадзейнасці праходзіў пад кіраўніцтвам настаўніка тав. Гаса і паказаў, што ў 14-й школе добра наладжана мастацкая самадзейнасць вучняў.

Л. Райскі.

Спекулянтка

Асноўным і адзіным заняткам Р. Р. Ландо была скупка розных тавараў і перапродаж іх па высокіх спекулятыўных цэнах. У яе знойдзена 72 кавалкі гаспадарчага мыла, 16—туалетнага, 38 пар панчох, 30 пар наскоў, мануфактура і т. д.

Днямі справу Р. Р. Ландо разглядаў беластоцкі народны суд 1-га ўчастка (суддзя — тав. Мядзведская, народныя засядацелі —Гжэсь і Саламянка) пры ўдзеле пракурора тав. Лукоўнікава і адваката тав. Тылемана.

Суд прыгаварыў Ландо да 5 год пазбаўлення волі.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

23 лістапада, у 8 гадзін вечара, у памяшканні педінстытута адбудзецца агульнагарадскі сход камсамольскага актыва горада Беластока.

Парадак дня: Даклад аб ходзе падрыхтоўкі да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Дакладчык — тав. Ражноўскі.

Беластоцкі гарком ЛКСМБ.

Адказны рэдактар Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ.

Адрас рэдакцыі: БССР, г. Беласток, будынак аблвыканкома. Тэлефоны: адказнага рэдактара—17-62, адказнага сакратара—49, аддзелаў прапаганды і партыйнага—16-10, эканамічнага аддзела—праз камутатар аблвыканкома, № 23, аддзел пісем—праз камутатар аблвыканкома, № 22. Выдавецтва і бухгалтэрыя—14-32.

УБ — 102. Тыраж 12.000 экз. Друкарня Беластокдруга.